# Ад усходніх крэсаў да заходніх межаў



Настасся ПРОШКІНА (аўтар нарыса) са Святланай Тарасавай

Прапаную вам сваю даследчую работу «Ад усходніх крэсаў да заходніх межаў: (жыццёвыя і творчыя дарогі Тарасавай Святланы Мікалаеўны, пісьменніка, літаратуразнаўцы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі)».

У Хоцімскім раёне знаходзіцца самая ўсходняя геаграфічная кропка Беларусі. Даўней казалі, што тут салаўі спяваюць на тры губерніі: Магілёўскую, Смаленскую і Бранскую. Тут, на «далёкім усходзе» Беларусі, адзінай сям'ёй што пасля пераводу бацькоў на іншую працу, на іншае месца жыхарства, рэдка даводзілася бываць у мілай сэрцу Васілёўцы, дзе крок за крокам пазнаваўся свет, дзе спасцігалася першая жыццёвая навука».

Любіла Святлана наведваць маміны ўрокі, хаця не разумела там яшчэ многага. Калі Святлане было шэсць гадоў, яе бацьку перавялі на працу ў калгас, цэнтр якога знаходзіўся ў вёсцы Юзяфоўка. Там, у Юзяфоўскай васьмігадовай школе, Ельнянскай тады васьмігадовай школы: дырэктару Надзеі Цімафееўне Палунчанка, біёлагу Ніне Паўлаўне Лукашовай, матэматыку Тацццяне Іванаўне Зэйдзінай, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Тацццяне Антонаўне Дробышавай, класнаму кіраўніку Пятру Барысавічу Падабед і ... маме, найлепшаму настаўніку-філолагу і дарадцы ў самых розных справах.

Нечаканым жыццёвым прытулкам для маладой дзяўчыны на наступныя два гады стане пякучы паўднёвы горад Краснадарскага краю Армавір. 9 «Б» клас быў вялікі нават па сучасных мерках – 42 вучні. Толькі ў яе класе вучыліся прадстаўнікі васьмі нацыянальнасцей. Варожасці ці непрыязных адносін адзін да аднаго ніколі не было. Запомнілася вучоба і выдатнымі настаўнікамі. Сёння Святлана Мікалаеўна пераканана: сапраўдным патрыётам яе зрабіў той далёкі ад Беларусі Армавір. Яна адчула сваю адметнасць і пераканалася, што сваёй нацыяй можа па-сапраўднаму ганарыцца. Пазней, ужо будучы студэнткай універсітэта, пры вывучэнні творчасці і біяграфіі Максіма Гарэцкага Святлана Тарасава дазналася, што ў Армавіры з пасляваеннага часу засталіся жыць прадстаўнікі роду Гарэцкіх. Як яна шкадавала, што не ведала гэтага падчас сваёй «паўднёвай камандзіроўкі»!

Сёння Святлана Мікалаеўна пераканана: сапраўдным патрыётам

пільнай увагай Тацццяны Яўгенаўны. Яна вучыла аналізаваць літаратуру, быць уважлівай да мастацкага слова, даносіць сваю думку да слухача або чытача.

Па заканчэнні ўніверсітэта малады спецыяліст Святлана Тарасава была накіравана на працу ў родную Магілёўскую вобласць. Пакідала Гродна са шкадаваннем: прыкіпела да гэтага горада душой. А ён і не спяшаўся забывацца.

Ужо ў 1990 годзе Святлана Мікалаеўна паступіла ў якасці спашукальніка ў аспірантуру Інстытута літаратуры пры Акадэміі навук БССР па спецыяльнасці «Беларуская літаратура». А месцам пастаяннага жыхарства стаў такі родны горад Гродна. Пачалася новая праца, закруціліся новыя падзеі, што абнадзейвалі і ўзрушвалі адначасова.

З 1 жніўня 1990 года пачаўся адлік новага этапу жыцця і працы Святланы Мікалаеўны. Яна была залічана ў склад штату выкладчыкаў, тады яшчэ на пасаду выкладчыка-стажора кафедры беларускай літаратуры. Сёння яна дзівіцца той сваёй смеласці, бо, каб узяцца за такую працу, трэба мець значны багаж вопыту і ведаў. Вопыт быў недастатковы, веды, так здавалася, раскіданыя і бессістэмныя. Адчуваліся і скептычныя адносіны калег да першых спроб у выкладанні і ў навуковай працы. Святлана Мікалаеўна ўпарта даказвала сабе і іншым, што можа справіцца з такой адказнай працай, хоць да самасцвярджэння ў прафесіі прайшло яшчэ нямала часу.

У 1992 годзе ў друку пачалі з'яўляцца першыя артыкулы па беларускай літаратуры Святланы Тарасавай.

Выкладчыцкая праца адметная тым, што грунтуецца не толькі на класічным выкладанні вучэбных прадметаў. У ёй шмат іншых напрамкаў: навуковая, куль-

названым людзям, у 2014 годзе Святлана Мікалаеўна Тарасава была прынята ў склад Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Перыяд пачатку новага стагоддзя быў багаты на падзеі, сустрэчы, паездкі. Гэта навуковыя замежныя і рэспубліканскія канферэнцыі, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі з Беларусі, Польшчы, Швецыі, Латвіі, арганізацыя ўласных літаратурных мерапрыемстваў, праца са студэнтамі, і многае іншае. «Не думалася раней, што гэта ўсё можа быць так узаемазвязана, - прызнаецца Святлана Мікалаеўна. - Але галоўнае: ёсць жаданне працаваць. Толькі часам вельмі шкадую, што так аддалена сёння ад мяне мая малая радзіма. Затое ведаю: яна ў мяне ёсць! І гэта надае сілы і ўпэўненасць.»

Прафесійныя дасягненні Святланы Мікалаеўны былі неаднаразова адзначаны падзякамі і ўзнагародамі розных узроўняў. У 2010 годзе яна ўзнагароджана Ганаровай граматай упраўлення адукацыі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта за актыўную работу па развіцці творчых здольнасцей адораных навучэнцаў і студэнтаў. За аўктыўную працу з творчай моладдзю адзначана Граматай абласнога камітэта БРСМ. У 2013 годзе Святлана Тарасава ўзнагароджана Прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асобы ўклад ў развіццё здольнасцей адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Сёння за плячыма С.М.Тарасавай не толькі свае дасягненні, прыемна радуюць поспехі яе выхаванцаў-студэнтаў. У 2017 г. студэнтка філалагічнага ф-та УА «ГрДУ» Аляксандра Радковіч стала пераможцай рэспубліканскага конкурса «Студэнт года». У яе перамозе ёсць і непасрэдны ўклад яе куратара, навуковага кіраўніка Тарасавай С.М. Магчыма таму ў 2018 г. на ўручэнні самай прэстыж-

